*Ірына Гоўзіч (Мінск)*

# *Прытчападобнасць як адзін з асноўных мастацкіх прыёмаў у творчасці Максіма Гарэцкага і Янкі Сіпакова*

Прытча - жанр старажытны. Эталагічны. Павучальны. Біблеістычны. Грунтуецца ён на мастацкіх прынцыпах іншасказальнасці, упадабнення, перанясення адных прыкметаў на другія і значнага абагульнення. Усе гэтыя адзнакі ідуць здаўна, з старажытнасці, былі ўласцівыя творчасці і Гамера, і Эзопа, і Сумарокава, і многіх іншых мастакоў свету, што браліся за раскрыццё агульначалавечых маральна-этычных праблемаў. Гэты жанр блізкі прыёмамі пісьма да байкі, казкі, метафары, да тых твораў, у якіх не на апошнім плане мараль, дыдактычная выснова, сэнсавая падтэкставасць. Ён супрацьлеглы жанрам апісальным, выяўленчым. Асобныя байкапісцы (Эзоп, Сумарокаў, напрыклад) увогуле называлі свае дасціпныя творы прытчамі.

У пэўныя перыяды развіцця мастацтва (Асветніцтва, постмадэрнізм) прытчападобнасць становіцца як бы СРОДКАМ ВЫЖЫВАННЯ ВЫСОКАГА МАСТАЦТВА, яго самазахавання і ад залішняй ідэалагізацыі, і ад рафінаванай спрошчанасці, і ад барочнай прыдворнасці. Прытчападобнасць - не толькі канкрэтны мастацкі прыём, але і ХОД ДУМКІ, СПОСАБ МЫСЛЕННЯ вобразамі, якому цесна ў рамках нарматыўных, класічных, традыцыйных эстэтычных канонаў. На сучасным этапе - гэта прэрагатыва як пераважна рэалістычнага (В.Быкаў, А.Адамовіч, В.Казько, Я.Сіпакоў), так і мадэрнісцкага мастацтва. Першае наслойвае на праўдзівае незвычайнасць, загадкавасць, сімвалічную ўмоўнасць, другое - перасатварае жыццё ва ўмоўную метафару, у іншасказ, надае відавочную перавагу вымыслу, разбурае стройны ланцуг праўдападобнасці, дэтэрмінаванай сувязі з'яваў, падзей і ўчынкаў.

Як часта бывае ў нашай нацыянальнай літаратуры, на мяжы рэалізму і мадэрнізму шукаюць сябе многія аўтары, і сярод іх - Янка Сіпакоў, паэт і празаік, прытчападобнасць творчасці якога становіцца для яго магутным сродкам пазнання ГАРМОНІІ АЛАГІЧНАГА Ў МАЛЫМ ЧАСЕ ЖЫЦЦЯ, дадатковага пазнання яго карнавальнай сутнасці.

Прытчападобнасць у сучасным мастацтве слова часцей за ўсё з'яўляецца не толькі спосабам уцёкаў ад рэальнага свету ў свет фантастыкі, а і каталізатарам аналітычнага пазнання яго ў пераламленні вечных ісцін, у праекцыі на будучыню.

На пачатку станаўлення сацыялістычнага грамадства ў бальшавіцкім варыянце з'явіўся шэраг твораў - прысудаў новым мадэлям сацыяльнай існасці ("Катлаван" А.Платонава, "Запіскі Самсона Самасуя" А.Мрыя, "Ні госць ні гаспадар" Л.Калюгі і інш.), у якіх прытчападобнасць набыла выразныя адзнакі сатырычнай афарбоўкі, служыла стварэнню жанра антыўтопіі пазнейшай пары. Некалькі іншым шляхам - шляхам паглыблення трагедыйнага пачатку, пераводу парадаксальнага і алагічнага ў план сурова-балючага, пакутніцкага, павучальна-біблейскага (прыкладам таму можа служыць агульнавядомая "Прытча пра блуднага сына"), з нязначнымі элементамі ка-

мікавання (сумнага, балючага) пайшоў Максім Гарэцкі ў сваіх пазнейшых, незавершаных у высылцы творах "Лявоніус Задумекус" і "Скарбы жыцця". Тое ж самае крытычнае стаўленне да эксперыментаў, што праводзіліся над чалавечым жыццём, ён падае ў форме трагічнай прытчы пра лёс Блазна (Блазённага), якому няма дзе і няма да каго прыхінуцца на Зямлі, якога зачынілі ў жалезную клетку пакутаў, недаверу, шантажу, абыякавасці. Тэатр абсурду ў адлюстраванні Гарэцкага дзеецца не ў святле пражэктараў, а ў бяздонным змрочным царстве Аіда... Вось адчыняе лірычны герой (позні творы Гарэцкага ў вышэйшай ступені лірызаваныя, суб'ектыўна значныя, медытатыўныя) "браму скарбаў сваіх" з вялікай цяжкасцю, а ў ёй аказваюцца "залатога смутку багатыя скрыні, самацветнай бяссільнасці доўгія нізкі, бясцэннае роспачы буйныя зерні..."☐ Як бачым, твор і пачынаецца, як прытча пра чарговы зман, няздзейсненыя светлыя мары, як біблейская прыпавесць пра духоўны апакаліпсіс.

І вось, урэшце, адчыненыя паржавелыя завесы цяжкаватай і "панурай" брамы, да таго ж з сапсаваным замком, і апавядальніку, а праз яго - чытачам адкрылася жахлівае відовішча зганьбаванага, здратаванага свету, населенага жабракамі, хадзячымі шкілетамі, мерцвякамі, купалаўскімі відмамі, блазнамі, налпамі, атрыбуты якога - гнілыя "патрухнелыя" крыжы, падземныя склепы і катавальні, дарогі ў НІШТО і ў НІКУДЫ: "Святло згасне, праўда знікне, крыўда запануе... І ратунку жаданага не будзе, не будзе... Разбой у цемнаце начной закіпіць. Пасохлая ніва пасыплецца на чорны дол. Патмосец жаласна заенчыць... На тым маскарадзе бачыў я страшны хадзячы шкілет. І скамянеў ад жалю..." [2]. Гэтая фраза можа быць і пачаткам, і канцом прытчы пра няздейстненыя чалавечыя мары, пра незлічоныя парадоксы жыцця, пра смерць як адзіны сродак выбаўлення ад пакутаў, ад не па сваёй волі блазенства і нават ад Веры, якая па волі Госпада павінна наталяць чалавечыя душы ды быць бессмяротнай. Выразная трагедыйная выснова заключана ў лаканічным, змрочным-змрочным спавядальным маналогу "Скарбы жыцця", маналогу-прытчы пра свет, што звузіўся да рыскі, скандэнсаваўся ў кропку велізарнага, нясціхнага болю.

Не меншае трагедыйнае гучанне мае і "Лявоніус Задумекус", у якім такая ж выснова квітнее на ўсю моц і халодзіць сэрцы чытача. Аповесць гэтая сваім вандроўным сюжэтам, разгорнутым у часе і прасторы, нагадвае "Прытчу пра блуднага сына". Ды толькі канец у ёй больш трагічны, як бы не завершаны: Блазен так і не вярнуўся ў краіну светлай мары, не знайшоў райскага кутка, не прыхінуўся да страчаных родных і блізкіх людзей. Свет для яго зачыніўся ў трагічнай сутнасці, у коле трагічных абставінаў, падобна купалаўскім паязджанам, ён аказаўся ў замкнёнай прасторы бессэнсоўнага руху ў НІКУДЫ. Максім Гарэцкі і выяўляе сябе падобнай "раскруткай" падзей як экзістэнцыяліст: самакаштоўная і значная асоба пад маскай Блазна ў сіле абставінаў адно толькі здольная захаваць свае мары, сваю духоўнасць, бадай, незразумелую нікому: "Вуліца жыцця твайго абарвецца. Нумару далейшага не будзе. Праз шчыліну ў плоце пралезеш. На той свет. (...) Пустэльня мёртвая будзе вакол цябе".☐ Змрочнае прароцтва. Аднак вера ў сябе, у сілу блазёнскага духу ўсё ж цепліцца. Пісьменнік стварае карціну

разбуранага жыцця-пустэльні, дзе ён сам, адзіны, яшчэ аказваецца ў стане АЦЭНЬВАЦЬ ТОЕ, ШТО РОБІЦЦА ВАКОЛ, адчыняць і зачыняць браму сваіх скарбаў. Цяпельца веры ў душы Блазна паратоўнае. Блізкае да быкаўскага, хэмінгуэеўскага, сіпакоўскага. Вера-цяпельца - "апанент" дэструктыўнай кан цэпцыі рэчаіснасці, уласцівай многім сучасным постмадэрністам і гэтаму літаратурнаму напрамку ў цэлым.

Максім Гарэцкі, бясспрэчна, прытчападобны. Апошнія творы яго - аповед пра свет-карабель, што страціў арыенціры ў акіянскай прасторы і кіруецца не на Патмос - востраў спакою і шчасця, а ў Нішто, у Бездань, Змрок. У апошніх сваіх творах вялікі мастак стварыў прытчу пра блуднага сына, якому няма куды і няма да каго вярнуцца.

Прытчападобнымі з'яўляюцца многія творы Янкі Сіпакова - як паэтычныя, так і празаічныя. Прыгадаем асобныя з іх. "Скарга прыручанага воўка" - прытча пра страчаную свабоду, пра жыццё на волі, якое немагчымае ў канкрэтных умовах, калі ці не самы вальналюбны звер апынуўся ў звярынцы ў клетцы і - што яшчэ больш жахліва - насупраць зайца, што выскаляецца з вечнага ворага свайго. "Вяртанне ў лес" - не менш знакаміты, прытчападобны твор пра прыручанага і навучанага людзьмі розным штукам мядзведзя, якому пры наведванні іх на свабодзе суродзічы адмаўляюць у прызнанні, які, нарэшце, гіне ад стрэла вартаўніка статку, чалавека. Гіне ад людзей, іншапляменцаў, якія яго скалечылі, перайначыўшы на свой лад, ператварыўшы ў марыянетку, у НІШТО, у НЕДАРЭКУ і ДЗІВАКА ў вачах тых, ад каго ён адарваўся, пра якіх забыўся на пэўны час. Прытчападобныя і творы паэта, якія ўвайшлі ў кнігу "Веча славянскіх балад" - пра духоўную смерць людзей, якія здраджваюць сваім караням, традыцыям, забываюць сваё імя, свой народ. Кніга - пра адзінства як гарантыю перамогі, смеласць як выклік ворагам, што вядзе да перамогі, супольнасць як форму выжывання ў самых экстрэмальных умовах. Рабі дабро, стой за народ і Радзіму, вер у сілу духу - і ты пераможаш. Такая выснова большасці баладаў са знакамітай кнігі пісьменніка. У цэлым - гэта кніга прытчаў пра перамогу дабра, а не зла, святла, а не змроку. У ёй апавяданне апісальнае яднаецца з заглыбленым аналізам духоўнага свету нацый, нацыянальных характараў, нацыянальных менталітэтаў, канкрэтныя сюжэты і факты "перарастаюць" сябе, ператвараюцца ў алегорыі, робяцца своеасаблівымі кропкамі адліку агульных (агульначалавечых) ісцін. На падзею, такім чынам, нарошчваецца дадатковы патэнцыял філасофскага зместу. Як у метафары. Згаданыя творы вытрыманы ў рэалістычным стылю, з рамантычнай "падсветкай". Як і не згаданыя, але вартыя увагі яшчэ больш агульныя па заключаным у іх прытчавым змесце вершы "Да біяграфіі майго народа. I", "Да біяграфіі майго народа. II", "Да біяграфіі майго народа. III" і іншыя, у якіх народны лёс паўстае ў кульмінацыйных гістарычных момантах, пераважна трагічных, дзейнічае людская супольнасць, што перамагае заклятых ворагаў сілай духу і еднасці. Рэальныя эпічныя сцэны (вайна і мір) ператвараюцца ў горкія прытчы пра суровую праўду выжывання народа ў экстрэмальных умовах.

Асабліва выразна талент іншасказальнага, метафарычна-прытчавага пісьма выявіўся ў празаічных творах пісьменніка - "Пажар", "Клетка", "Яма",

"Гармонік", "Зона", "Слабыя і моцныя", "Лета з мянушкай", "Тыя, што ідуць" і іншых. Яны склалі аснову другога тома пісьменніка 1997 года выдання. У іх не толькі выразна "спрацоўвае" прытчападобнасць як мастацкі прыём, а і самі яны становяцца разгорнутымі прытчамі і метафарамі. Аўтар даў ім менавіта такое жанравае вызначэнне, вылучыў у кнізе ў асобны, цэнтральны раздзел. Што кідаецца ў вочы пры чытанні выдатных твораў, дык гэта арыентацыя мастака на перасатварэнне "жывой рэальнасці" у не менш жывы вымышлены свет. Звычайны жыццепадобны сюжэт ператвараецца ў міф, у філасофскае разважанне, фантазійныя мроі. Героі і дзеі вольна пераводзяцца з праўдападобнага свету ў свет фантазійны (як у "Клетцы"). Пакараны з чалавека ў велізарную птушку - Сінявока, здольны ўзляцець у нябесы з сваёй турэмнай "камерай" і не прызнаны Каханай і сынам; не то селянін Бусел, не то птушка бусел, што назіраюць, як гінуць і хлявы, і хата; не то людзі, не то мятлушкі Ясень і Мятлушка, што могуць перасатварыцца ў бесклапотныя істоты і горка сумаваць ад неўладкаванасці жывога жыцця. Свет распаўся ў творах пісьменніка на рэальны і нерэальны, героі - таксама. Падзеі адбываюцца і ў храналагічна абмежаваным часе, і ў вечнасці. Напрыклад, так, як у ці не самым магутным, шматзначным метафарычным творы "Тыя, што ідуць"... Выпадкова дачнік, звычайны чалавек, сустракаецца з людзьмі-прывідамі, што ідуць неяк незвычайна: "быццам плылі ў вадзе ці, наадварот, рухаліся ў беспаветранай прасторы". Сляпыя, нямыя, глухія, яны нават ноччу мала адпачываюць: будуюць хаты, аруць поле, сеюць жыта і пры першых сонечных промнях ідуць у паход усё далей і далей, вядомыя сваім вадаром Белабогам і Прыгажуняй. Патрапіў у нерэальны свет, але досыць гарманічны, адзначаны гуманістычнымі дзеямі, далучыўся да яго, стаў у ім прызнаным, каханым Прыгажуняй Незнаёмы. Ён таксама будуе дамы, таксама не дасыпае начамі, таксама творыць дабро на зямлі. І, вярнуўшыся ў свет рэальны, парабіўшы работу на ўчастку, ён ператвараецца зноў у Падарожніка, даганяе тых, што ідуць. Такая фабула фантазійнага твора. Твора метафарычнага. Твора - прытчы пра рух наперад як збаўленне ад змірання і смерці. У агульным плане ці не разгорнутая гэта метафара нашага застойнага і падчас невыносна-змрочнага, бязрадаснага жыцця - таго жыцця, якое, магчыма, не мае сэнсу? Ці не прытча гэта пра народ, які яшчэ да гэтай пары шукае свайго прытулку на зямлі, у сваім краю жыве, як у летаргічным сне? Што абудзіць гэты народ ад сну? Не выпадкова звычайны чалавек, але ВІДУШЧЫ, ідзе з жыцця рэальнага, населенага такімі ж, як ён, у жыццё прывіднае. Ідзе, каб ратаваць і весці за сабой НЕВІДУШЧЫ народ, што апынуўся ў бядзе. Фінал апавядання-прытчы, разгорнутай метафары абнадзейвае не толькі Падарожніка - апантанага прагай дабра, але і чытачоў у магчымасці дасягнення Праўды, перамогі ВІДУШЧАСЦІ на планеце Зямля: "Там быў разумны Белабог. Там была Прыгажуня. Там, хутчэй за ўсё, рос ужо і яго сын - можа, вось зараз ён ідзе якраз поплеч з валадаром. І яшчэ ён між волі адчувае, што там неўзабаве яму даверацць нешта вельмі важнае і сур'ёзнае - магчыма, нават у бліжэйшую сяўбу яго зробяць Галоўным Сейбітам. Зараз Падарожніку здавалася, што ён абраны, нават асуджаны кімсьці на гэты рух і на гэтую вандроўку. Усё, о Божа, як ты і кажаш, вяртаецца на кругі свая."□

Нельга назваць прытчы і метафары Янкі Сіпакова чыста мадэрнісцкімі ці постмадэрнісцкімі творамі. Можна назваць іх творамі, якія, вырастаючы на рэальнай глебе, прарастаюць зернямі нейкага новага, ужо не прасталінейнага, а фантазійна-мройнага мыслення. Гэта творы, у якіх побач з праўдай буяе вымысел, малы час перамяжаецца, перабіваецца часам вялікім, героі набываюць шматаблічнасць па волі мастака, перасатвараюцца ў сімвалы, набываюць адзнакі агульнасці (абагуленасці), як у міфах. Пра метамарфозы рэальнага жыцця, пра яго сучасныя, балючыя праблемы піша аўтар, зацікаўлены, як і бывае ў прытчах, у выпраўленні нораваў, у павучэнні - праз рэальны і нерэальны малюнак, рэальныя і надрэальныя падзеі, праз ГЛЫБОКАЕ ФІЛАСОФСКАЕ МЫСЛЕННЕ. Як, да прыкладу, у невялікай прытчы "Слабыя і моцныя", што асацыіруецца з нашым часам раз'яднання, а не паяднання, самазнішчэння, часам суцэльнага супроцьстаяння дабра і зла - адным словам, Бессэнсоўнасці, якую заўважылі, перасатварылі ў мастацкія, нам многім нязвычныя, палотны постмадэрністы... Моцныя абурыліся, што так многа развялося на зямлі слабых, што сеялі жыта, іх кармілі; перасаджалі іх у турмы, знішчылі... акрамя адной сям'і. І тая (адна!) сям'я вярнула сабе ўладу, калі ні на што не здольныя моцныя ўсе памерлі "цярпліва і пакорліва". Бо сям'я гэта ведала, што рабіць, "як і дзе дастаецца ежу". Род чалавечы выжыў з ласкі былых "слабых".

Прытча заканчваецца так, як і павінна заканчвацца: выбухам павучальнага зместу: "Гэта добра, што слабыя сталі моцнымі. Але кепска, што яны адразу ж пачалі шукаць сабе слабых... Каб ужо тыя кармілі і даглядалі іх. "Госпадзі – людзі, што вы робіце?!" - маглі б ускрыкнуць Мудрацы, але ніводнага з іх на той час не асталося нават у турмах... А без іх хто дапаможа разабрацца, што лепей: слабыя моцныя ці моцныя слабыя?"□

Янка Сіпакоў шукае новых прынцыпаў адлюстравання рэчаіснасці. Яго наваствораны мастацкі свет адрозніваецца ад свету Івана Мележа і вельмі блізкі да свету, створанага Васілём Быкавым у апошніх творах, дзе пануюць цемра, хаос, правяць баль змрочныя сілы, а чалавек застаецца каштоўнасцю ў сабе, часта адзінокай, ды нязломнай. Быкаўская канцэпцыя рэчаіснасці, як і сіпакоўская, уключае ў сябе магутныя элементы фантазійнасці, выразнага перасатварэння, спалучэнне парадаксальнага, заканамернага і выпадковага, асэнсаванага і бессэнсоўнага і тым самым набліжаецца да мадэрнісцкіх і постмадэрнісцкіх пошукаў новага зместу, новых ідэалаў, новых прыёмаў мастацкага пісьма. Адным з такіх прыёмаў і становіцца прытчападобнасць.

*Літаратура*

1. Полымя. 1993. №2. С.17.

2. Тамсама. С.23.

3. Тамсама. С.23.

4. Сіпакоў Янка. Выбраныя творы ў двух тамах. Т.2. Проза. Мн., 1997. С.339.

5. Тамсама. С.269.